# ДЗЕ БРУІЦЦА КРЫНІЦА…

Маргарыта УШКЕВІЧ
Фота аўтара, Анатоля ДРЫБАСА, vrg.by, з архіва Індурскага лясгаса



**Першы гідралагічны помнік прыроды быў аб'яўлены ў рэспубліканскім ландшафтным заказніку «Гродзенская пушча». І хаця ў Беларусі дзясяткі крыніц, якія знаходзяцца пад аховай дзяржавы, атрымаць такі статус зусім няпроста. Напрыклад, актывістам гродзенскага творчага калектыву «Прынямонне» спатрэбіўся не адзін год, каб даказаць каштоўнасць мясцовых крыніц.**

Удзельнікі гродзенскага гуртка, які створаны пры Інстытуце прыродакарыстання Нацыянальнай акадэміі навук (НАН) Беларусі, людзі дасведчаныя: краязнаўцы, гісторыкі, медыцынскія работнікі, архітэктары, мастакі. Усе дбаюць аб захаванні багацця, якое падарыла гэтаму краю прырода. Дзякуючы іх намаганням, на крыніцы была звернута ўвага і навукоўцаў, і мясцовых улад, і прыродаахоўных органаў.



Ініцыятар справы – кіраўнік грамадскага аб'яднання **Тэрэза БЕЛАВУСАВА**. Яе апантанасць вядома не толькі адпаведным службам, але і многім мясцовым чыноўнікам. За некалькі дзясяткаў гадоў сабраны даволі значны стос дакументаў і навуковых даследаванняў, якія вяліся ў Інстытуце фізіялогіі НАН Беларусі.

– У Гродзенскай пушчы прабураны свідравіны і знойдзены запасы мінеральнай вады, але праграма па яе здабычы была спынена, свідравіны закансерваваны. Не хачу, каб такі лёс напаткаў і крыніцы. Таму сёння мы робім усё, каб захаваць гэтыя прыродныя аб'екты, за якімі сачылі яшчэ мае продкі: падкошвалі траву, прывозілі камяні для абкладання дарожак, чысцілі наваколле. Цяпер мая чарга гэтым займацца. Хоць і паціху, але справа ідзе, – выказалася актывістка.

Такіх адметных крыніц у яе некалькі. У сям'і нямала паданняў аб тым, якія хваробы лечыць кожная. «Дасье» сабрана на шэсць самых вядомых, якія маюць уласныя назвы. Дарэчы, гэтыя імёны невыпадковыя. Ва ўсіх ёсць пэўны гістарычны падмурак.

### Адкуль у крыніц назвы

Крынічны край знаходзіцца ў наваколлі вёскі Прывалка. Ад Гродна крыху больш за 30 км. Адметнасць гэтага раёна ў тым, што ён прыгранічны. Ад літоўскага горада Друскенікі ўсяго каля 10 км. На думку старажылаў, мясцовая вада мае такія ж якасці, што і на вядомым курорце. Праз Гродзенскую пушчу працякае знакаміты Аўгустоўскі канал – помнік гісторыі і культуры XIX стагоддзя. Тут знаходзіцца самае

нізкае месца Беларусі – яміна, глыбіня якой 80 м. Згодна з паданнем, раней тут быў горад Райгарад, які праваліўся пад зямлю. Ад яго і атрымала назву крыніца, што цячэ ў гэтай мясцовасці. Праўда, гродзенскі краязнаўца **Аляксандр ГОСЦЕЎ** пазбягае містыкі і лічыць, што горад знік з-за таго, што Нёман у тыя часы па нейкіх прычынах змяніў сваё рэчышча. А пад ім праходзіць крэйдавы і крэмніевы шлейф, што ствараўся мільёны гадоў, які ачышчае падземную ваду. Таму і яна мае гаючую сілу.

Да крыніцы, што выцякае з трубы, вядзе добра пратаптаная дарожка, ёсць ступені. Прырода вакол дзікая, што адпавядае стану пушчы.

Яшчэ адна цікавая крыніца знаходзіцца ў некалькіх кіламетрах ад Гродна, у аграгарадку Гожа. Яе назвалі імем Элізы Ажэшкі. Вядомая пісьменніца пражывала ў Гродне, часам прыязджала ў вясковы храм і брала ваду з крыніцы. Аб гэтым Тэрэза Белавусава даведалася ад сваіх продкаў, што жылі ў гэтай мясцовасці.





## Ахоўны статус

Усе імянныя крыніцы ўвайшлі ў новае энцыклапедычнае выданне «Крыніцы Беларусі». Тэрэза Іосіфаўна ў каторы раз раскладвае фотаальбомы, зборнікі, карты, папкі з афіцыйнымі перапіскамі і дакументамі, публікацыі ў СМІ, шматлікія падзякі. За кожнай такой паперкай – няпростая і нярвовая работа па ахове крынічнай экасістэмы ў Гродзенскім раёне. І ўсюды яна расказвае аб «сваіх» крыніцах, планах, ідэях, а галоўнае аб тым, што чыстая вада – даволі значная праблема.

Гродзенскіх актывістаў пачулі. Сумесны праект з Гродзенскім абласным камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя па наданні шасці крыніцам ахоўнага статусу атрымаў падтрымку ў адпаведным міністэрстве. Такім чынам, у Гродзенскай пушчы ўпершыню з'явіліся крыніцы – помнікі прыроды мясцовага значэння.

– Для надання крыніцам ахоўнага статусу праведзены даследаванні, якія вызначылі, якая гэта вада, якія сюды ўваходзяць кампаненты. Зроблена табліца мікраэлементаў, утрымання хімічных рэчываў, атрыманы аналіз біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці крынічных вод, іх гісторыка-культурнае значэнне. Вынікі даследаванняў увайшлі ў пакет дакументаў для разгляду камісіі райвыканкама. Сабраны матэрыял даў падставу для прыняцця рашэння аб аб'яўленні крыніц помнікамі прыроды мясцовага значэння, – удакладніла алгарытм работы Тэрэза Белавусава.

Перамога ў конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў дазволіла значна прасунуць справу па добраўпарадкаванні крыніц. З дапамагой гродзенскіх скульптараў і работнікаў лягаса былі ўсталяваны стылізаваныя драўляныя ўказальнікі, зроблены дубовыя лаўкі, навесы, сталы і нават скульптура дзяўчыны, якая сядзіць з кубачкам у руках каля крыніцы Элізы Ажэшкі. Устаноўлены сметніцы, дарожкі пасыпаны жвірам.



– Гэта непасрэдна наш профіль работы. З цягам часу будзем мяняць трубы некаторых крыніц, – паведаміў ляснічы Гожскага лягаса **Назарый КОРШАК**. – Мы вядзём санітарную ўборку каля крыніц кожны тыдзень. У нашым лясніцтве даволі шмат крыніц, можна сказаць, яны б'юць у кожным яры.

На думку прадстаўніка лягаса, супрацоўніцтва з грамадскімі арганізацыямі важна ў плане падтрымкі экалагічнай раўнавагі, чысціні навакольнага асяроддзя. Варта, каб людзі ведалі аб прыродным багацці і мелі магчымасць карыстацца чыстай вадой.

## Водны рэсурс у дзеянні

«Крынічная» справа не стаіць на месцы. Тэрэза Белавусава па-ранейшаму не выпускае яе з поля зроку. У бліжэйшы час творчы калектыў мяркуе выйсці з чарговым праектам на конкурс грамадзянскіх ініцыятыў, які праводзіць абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў. Наступным этапам, на думку актывістаў, павінна стаць распрацоўка тыповага праекта па добраўпарадкаванні крыніц – помнікаў прыроды. Аб'екты важна вызначыць на мясцовасці і стварыць вакол іх пэўны антураж. Напрыклад, зрабіць больш зручны падыход, нейкі арыгінальны навес, паставіць шыльды, лаўкі. Разам з тым захаваць адметнасць кожнай. Гэтую функцыю павінны ўзяць на сябе мясцовыя органы ўлады. І пэўныя захады ўжо зроблены. Напрыклад, крыніцу Элізы Ажэшкі дапамаглі абсталяваць у Гожскім сельсавеце. Цяпер тут штогод праходзіць вясковае свята «Залатыя ключы», прысвечанае крынічнай вадзе.

Магчымасці крыніц зацікавілі работнікаў культуры Гродзенскага райвыканкама. Той факт, што ўсе яны знаходзяцца ў адной мясцовасці і маюць непаўторны прыродны антураж, спрыяе стварэнню экалагічнага турыстычнага маршрута.

– Вядома, у ідэале хацелася б паказаць падрыхтаваныя пляцоўкі, прадумаць маршрут. Магчыма, дапоўніць яго іншымі аб'ектамі, каб людзі атрымалі яшчэ нейкія відовішчы, каб ім было цікава. Пакуль мы бачым, што ўсе крыніцы патрабуюць значных фінансавых укладанняў, бо трэба зрабіць і пад'езды да іх, і самі аб'екты. Гэта кладзецца на плечы землекарыстальнікаў. Добра тое, што да крыніц зараз з'явіўся інтарэс як з боку ўлад, так і грамадскасці, таму што гэта агульнае багацце, – выказала меркаванне начальнік аддзела культуры Гродзенскага райвыканкама **Таццяна КУЗЬМА**.

А між тым, вада з крыніцы – яшчэ і вельмі каштоўны прадукт. Як расказала доктар медыцынскіх навук, прафесар кафедры рэабілітацыі Гродзенскага медуніверсітэта **Ларыса ПІРАГОВА**, зараз у аздараўленні вельмі важнае значэнне надаецца прыродным фактарам. А ў гэтай вадзе ўтвараюцца натуральныя аэраіоны, якія станоўча ўплываюць на арганізм чалавека. Буціліраваная вада – не тое, што крынічная. Яна губляе свае якасці, бо праходзіць працэс абеззаражвання і абпраменьвання ўльтрафіялетам, яна не такая карысная.

– Нашы санаторыі таксама скіраваны на аздараўленне прыроднымі фактарамі. Гэта аэраіонатэрапія, мінералатэрапія, янтарныя і саляныя пакоі... Укараняецца шмат методык з уздзеяннем прыродных фактараў, у тым ліку крыніц, – акцэнтуе ўвагу Ларыса Пірагова.

Дарэчы, яна падтрымала ідэю творчага калектыву «Прынямонне», які выйшаў з прапановай укараніць у вучэбны працэс Гродзенскага медыцынскага ўніверсітэта новую праграму па вывучэнні, лабараторным даследаванні і прымяненні ў медыцынскай практыцы мінеральна-сыравінных рэсурсаў – крынічнай вады і тарфяна-сапрапелевай гразі заказніка «Гродзенская пушча». Прапанова падтрымана на ўзроўні ўніверсітэта і будзе разглядацца ў вышэйшых інстанцыях. Дарэчы, такая практыка павінна стаць першай сярод медыцынскіх ВНУ Беларусі.

Актывістка Тэрэза Белавусава, у сваю чаргу, будуе планы па стварэнні інклюзіўнай прасторы для інвалідаў-калясачнікаў, марыць аб адкрыцці музея крынічнай вады і рыхтуе маршрут аздараўленчага турызму, аснову якому паклала сама прырода. ■

